Алег Дзярновіч

# Рэканструкцыя Ніжняга замка ў Вільні: прафесійныя праблемы і грамадскі кантэкст

Разглядаючы праблемы рэстаўрацыі і музеефікацыі замкаў у Цэнтральнай і Усходняй Еўропе, варта зацікавіцца аднаўленнем Ніжняга замка ў Вільні. Гісторыя гэта можа быць у нечым павучальная. А значнасць, якую маюць Віленскія замкі для нашага гісторыка-культурнага рэгіёна, патрабуюць пільнай увагі беларускіх даследчыкаў да гэтых аб’ектаў і да работы, што там адбываецца. У сваім выступленні хацелася б засяродзіцца на грамадскім кантэксце аднаўлення Ніжняга (Дольнага) замка і на тым, як гэты кантэкст ўплывае на вырашэнне прафесійных праблем.

## Комплекс Віленскіх замкаў

Напачатку крыху гісторыі. Віленскія замкі [1] – гэта комплекс мураваных замкаў сталіцы ВКЛ, дзе ў XIV – сярэдзіне XVII ст. знаходзілася рэзідэнцыя Вялікіх князёў Літоўскіх, іншыя цэнтральныя адміністрацыйныя інстытуты ВКЛ XIV–XVIII стст. Комплекс складаўся з Верхняга (Горнага) і Ніжняга (Дольнага) замкаў. У канцы XIII – пачатку XIV стст. паселішча ля падэшвы гары было пераўтворана ў Ніжні замак. У пачатку XIV ст. большасць прасел мураваных сцен былі ўжо пабудаваны; іх вышыня дасягала 9–10 м, таўшчыня 1,7–3,1 м. Муры замка мелі працягласць звыш 1 км, утваралі нерэгулярны, поліганальны план. Большасць вежаў мела двухбаковы вынас, знаходзіліся на значнай адлегласці адна ад другой. Самая старажытная мураваная вежа Ніжняга замка мела квадратны план (13,5 х 13,5 м), рэшткі яе захаваліся пад падмуркам званіцы кафедральнага сабора. Першае ўпамінанне пра Віленскі замак датуецца 2 кастрычнікам 1323 г. – у пасланні Гедыміна да Нямецкага ордэна і Рыгі [2]. Мяркуецца, што мураваныя сцены Верхняга замка на Гедымінавай (Замкавай) гары былі ўзведзены ў першай палове XIV ст. і па загаду Вітаўта перабудаваны ў пачатку XV ст. (магчыма, пасля моцнага пажару 1419 г.). Сёння вышыня Замкавай гары дасягае 48 м, замак займае пляцоўку памерамі 110–120 х 50–60 м, даўжыня сцен складала 320 м. Пасля 1387 г. (хрышчэння Літвы) у паўднёва-заходнім куце Ніжняга замка быў пабудаваны рымска-каталіцкі кафедральны сабор і палац Віленскіх біскупаў. У далейшым гэта частка замка афармляецца ў царкоўную функцыянальную зону – разам з рэзідэнцыямі вікарыя і віленскай капітулы. У XV – пачатку XVI ст. пад званіцу сабора была прыстасавана старая абарончая вежа. Ля заходняй падэшвы Замкавый гары на мяжы XIII–XIV стст. пабудаваны мураваны палац; у XV ст. на гэтым месцы знаходзілася некалькі гатычных збудаванняў, якія ў першай палове XVI ст. былі ўключаны ў новую

вялікакняскую рэзідэнцыю, узведзеную ў стылі рэнесансу (іл. 1, 3). У сярэдзіне XVI ст. паўночная частка Ніжняга замка аформілася як арсенальная; у пачатку XVII ст. арсенал (цэйхгаўз) складаўся з трох асноўных карпусоў. Летам 1655 г. войскі расійскага цара Аляксея Міхайлавіча без вялікіх баёў авалодалі Віленскімі замкамі. Сіламі Рэчы Паспалітай 11 ліпеня 1661 г. горад быў вернуты, але баі за замкі працягваліся да пачатку снежня. Падчас войнаў сярэдзіны XVII ст. усе пабудовы Віленскіх замкаў моцна пацярпелі. У далейшым былі адноўлены толькі кафедральны сабор, біскупскі палац, арсенал.

Гаспадарскі палац

Рэканструкцыя Ніжняга замка ў Вільні 93



*1. Комплекс Віленскіх замкаў. З панарамы-плана Г. ван Браўна паводле малюнка Ф. Гагенберга (1545) (Bruynen G. van, Hoogenbergh F. Orbium praecipuarum totius mundi. Liber tertius. Colonia Agripina, 1581).*



*2. Гаспадарскі палац, выгляд на канец XVIII ст. Літаграфія Рачынскага, 1832.*



*3. Віленскія замкі ў пачатку XVII ст. Выгляд з поўдня. Рэканструкцыя Напалеонаса Кіткаўскаса.*

Адметная частка Ніжняга замка – вялікакняскі (каралеўскі) палац [3], рэзідэнцыя Вялікіх князёў Літоўскіх у другой чвэрці XVI – сярэдзіне XVII стст. Гістарычна дакладных звестак пра віленскую рэзідэнцыю Вялікіх князёў Літоўскіх у XIV—XV стст. у Ніжнім замку няма. Магчыма, яшчэ раней рэзідэнцыйныя функцыі выконваў мураваны будынак, узведзены на мяжы XIII–XIV стст. ля заходняй падэшвы Замкавый гары (рэшткі яго сцен з масіўнымі контрафорсамі выяўлены ў 1964 г.). У XV ст. на гэтым месцы знаходзілася некалькі гатычных пабудоў з балцкай (вендскай) муроўкай, якія ў першай палове XVI ст. былі ўключаны ў новую вялікакняскую рэзідэнцыю, пабудаваную ў стылі рэнесансу. Гэты палац быў узведзены ў 1520-х гадах па загаду Жыгімонта Старога, а кошт яго будаўніцтва склаў 100 000 дукатаў. Паводле вынікаў археалагічных даследаванняў, працэс будаўніцтва ўяўляецца наступным чынам: у старых Усходнім і Паўднёвым карпусах быў нарошчаны трэці паверх, Усходні корпус падоўжаны на поўнач, пашыраны ўнутраны двор палаца (50 х 50 м), пабудаваны новы Паўночны корпус. Ва ўнутраным двары знесена галерэя Усходняга корпуса і пабудавана новая, больш шырокая галерэя ў Паўднёвым корпусе. У адрозненне ад папярэдніх гатычных пабудоў вонкавыя муры палаца былі атынкаваныя. З захаду палац прымыкаў да кафедральнага сабора, а з поўдня ля палаца быў разбіты сад. Такім чынам, рэзідэнцыя ўяўляла сабой прыклад італьянскага *palazzo* нерэгулярнага тыпу. У 1544–48 гг. у палацы жыў Жыгімонт Аўгуст, спыняўся ён тут і пазней. Менавіта ён заснаваў у сваёй віленскай рэзідэнцыі вялікую бібліятэку і багатую калекцыю твораў мастацтва. Пазней у палацы спыняліся і жылі каралі і вялікія князі – Стэфан Баторый, Жыгімонт Ваза, Уладзіслаў Ваза. Падчас пажару 1610 г. палац пацярпеў, але быў адноўлены з выкарыстаннем шматкаляровага мармуру і пясчаніка (з гэтага каменя выраблены карнізы з гербам дынастыі Вазаў). У 1634 г. тут адбыліся першыя ў ВКЛ оперныя спектаклі. У выніку войнаў сярэдзіны XVII ст. палац атрымаў значныя пашкоджанні і ўжо не мог выконваць функцыі гаспадарскай рэзідэнцыі. Каля 100 гадоў будынак прастаяў без рамонту. Паводле рашэння Сойма Рэчы Паспалітай 1766 г. прыдатныя для жылля памяшканні ў другой палове XVIII ст. былі здадзены ў арэнду жыхарам Вільні, і тут пасялілася 25 сямей. Рамонт памяшкання яны рабілі сваім коштам (іл. 2). Менавіта ад таго часу засталося некалькі графічных выяў палаца (у тым ліку шырока вядомыя П. Смуглевіча). Рэшткі палаца былі знішчаны ўжо новымі расійскімі ўладамі. 19 кастрычніка 1799 г. магістарт Вільні паводле загада губернатара прадаў будынак купцу Слуцкаму з Крэменчуга, а ўжо на працягу 1800–1801 гг. рэшткі палаца былі разабраны. Захавалася толькі частка Усходняга корпуса, якая ў XIX ст. была перабудавана пад двухпавярховы жылы дом. У 1831–1837 гг. падчас будаўнцтва Віленскай цытадэлі тэрыторыю палаца перасёк роў глыбінёй 2,4 м. У 1878 г. цытадэль страціла сваю мілітарную значнасць і

была ліквідавана. У 1881–84 гг. былі скапаны валы, засыпаны рвы, на частцы тэрыторыі Ніжняга замка разбіты парк.

## Стан замкаў у другой палове XX ст.

У 1965 г. у рэканструяваным Новым арсенале (заходні будынак) пачаў дзейнічаць Гісторыка-этнаграфічны (цяпер Нацыянальны) музей. У адрэстаўрыраваным Старым арсенале (усходні будынак) адкрылася экспазіцыя Музея дэкаратыўна-ўжытковага мастацтва. З канца 1980-х гг. вядуцца працы па рэканструкцыі і далейшай музеефікацыі Ніжняга замка – адноўлены паўночныя муры і Паўночны будынак арсенала, дзе пачала дзейнічаць археалагічная экспазіцыя (Музей прагісторыі Літвы). На Замкавую гару пракладзены фунікулёр. Сярод захаваных аб'ектаў Ніжняга замка – архікафедральная базіліка і вежа-званіца.

У 1955–64 гг. літоўскія археолагі даследавалі тэрыторыю Ніжняга замка, але сістэматычнае вывучэнне рэштак менавіта палаца пачалося ў 1987 г. Інстытутам кансервацыі помнікаў, з 1988 даследаванні працягнуў Інстытут гісторыі Літвы. Гэтыя працы праводзіліся пад кіраўніцтвам археолага А. Таўтавічуса і архітэктара Н. Кіткаўскаса. Увосень 1989 г. ускрытая археолагамі частка палаца з усімі архітэктурнымі канструкцыямі

Рэканструкцыя Ніжняга замка ў Вільні 95



*4. Павільён над раскопам палаца.*

коўвацца ідэя аднаўлення ўсяго комплексу Ніжняга замка. І трэба сказаць, што падобныя прэцэдэнты ў навейшай гісторыі Літвы ўжо былі.

была накрыта дахам са шклопласту і стала даступнай для наведвальнікаў (іл. 4). Якраз у другой палове XX ст. у літоўскім грамадстве стала актыўна абмяркоўвацца ідэя аднаўлення ўсяго комплексу Ніжняга замка. І трэба сказаць, што падобныя прэцэдэнты ў навейшай гісторыі Літвы ўжо былі.

## Прэцэдэнт аднаўлення Трокскага замка

Тут маецца на ўвазе рэканструкцыя Трокскага замка на выспе возера Гальве, які з'яўляўся ўлюбёнай рэзідэнцыяй Вітаўта. Ужо ў 1950-х гг. была рэканструявана рэзідэнцыяльная частка замка – канвентхаўз. Само імкненне ўлад Літоўскай ССР адбудаваць замак выклікала неадназначныя рэакцыі ў Маскве, праявао чаго стала публікацыя ў газеце "*Известия*" ад 20 снежня 1960 г. пад назваю "*Время ли восстанавливать замки?*" Каб не пераказваць аргументы маскоўскіх журналістаў, прывяду цытату з гэтай публікацыі: "В старые времена в Литве было много феодальных замков. В течение столетий они разрушались. От одних остались только упоминания в исторических документах. Другие представляют собой развалины.

Сейчас вокруг некоторых из этих замков развернулось большое и дорогостоящее строительство. В составе Комитета по делам строительства и архитектуры при Совете Министров Литовской ССР создан большой аппарат научно-реставрационных мастерских с отдельным конструкторским бюро. Этому аппарату поручено поднять из руин памятники былого могущества феодалов. Миллионы рублей тратятся ежегодно на восстановительные работы.

Вот уже много лет восстанавливается из жалких развалин замок в Тракай. По величине затрат это сооружение может соперничать с мощным элеватором. А таких «строительных объектов» в республике – десятки. Повсюду – поедешь ли вниз по Неману, на север к границам Латвии или на запад к Приморью – всюду подымаются «замки-новостройки». Более того, сейчас архитекторы, войдя во вкус, начали восстанавливать даже почти бесследно исчезнувшие дворцы крупных литовских магнатов.

Мы не против бережного отношения к памятникам седой старины. Наиболее ценные из них в архитектурном и историческом отношении, конечно, следует реставрировать. Но стоит ли сейчас вести эти работы с таким размахом и с таким расточительством народных средств? Нам думается, нет. Не настало еще время для этого. Не так богата еще республика сейчас, чтобы тратить миллионы рублей на возрождение из руин древних замков. Чего греха таить, сооружаются они порой рядом с хуторами и селами, где быт людей еще плохо устроен, где остро не хватает производственных помещений в хозяйствах. Недостает культурных очагов, и часть их размещена в арендованных жилых домах. Да что говорить, в самом

Вильнюсе десятки домов нуждаются в срочном ремонте. Разве это менее важные проблемы, чем реставрация древних замков.

В нашей стране с особой заботой относятся к историческим памятникам. Но когда смотришь на скоростное восстановление замков Литвы, невольно думаешь о том, что и в этом деле, как и во всяком другом, необходимо чувство меры”[4].

Падобна на тое, што кіраўніцтва Літоўскай ССР паставіла справу так, што рэканструкцыя практычна датавалася з агульнасаюзнага бюджэту. І гэта, апроч ідэалагічных матываў, таксама выклікала незадаволенасць. Тым не менш, кіраўніцтва ў Вільнюсе настаяла на сваім і здолела, нягледзячы на ўсе інтрыгі, працягваць працы па рэстаўрацыі і рэканструкцыі Трокскага замка. І калі ў 1950 г. у замку пачаліся работы па кансервацыі фрагментаў помніка, то ў 1962 г. адчыніліся першыя залы музея ў вялікакняскай рэзідэнцыі[5]. А Літва атрымала свае дывідэнты ад рэканструкцыі замка, якая сталася ў тыя часы своеасаблівай нацыянальнай маніфестацыяй.

## Пачатак аднаўлення Гаспадарскага палаца

Тыпалагічна падобнае палітычнае рашэнне, але ўжо ў новых гістарычных умовах, было прынята на пачатку 1990-х гг., калі ўзнікла ідэя адбудовы Вялікакняскага палаца Ніжняга замка і прыстасаванне яго пад рэзідэнцыю Прэзідэнта Літоўскай Рэспублікі, якая з часам усё ж размясцілася ў былым палацы Віленскіх генерал-губернатараў (а гэта помнік яскравага ампіру, створаны Васілём Стасавым). Тагачасны Прэзідэнт Альгірдас Бразаўскас аднойчы выказаўся на гэты конт, што яму не дае спакойна знаходзіцца там сам факт, што ў гэтым будынку некалі жыў Мураўёў-Вешальнік. А пераезд Прэзідэнта ў былы вялікакняскі палац сімвалізуе працяг традыцыі літоўскай дзяржаўнасці.

Трэба сказаць, што самі даследчыкі Ніжняга замка, выдатныя спецыялісты ў галіне археалогіі і архітэктуры, таксама праявілі, як мне падаецца, ангажыраванасць. Прыклад гэтаму дае новая версія пра месца каранацыі Міндоўга ў 1253 г., аўтарамі якой з’яўляюцца якраз даследчыкі Ніжняга замка – археолаг В. Урбанавічус і архітэктар Н. Кіткаўскас. Яны мяркуюць, што каранацыя мела месца ў Віленскай катэдры[6]. Гэтая версія грунтуецца на інтэрпрэтацыі вынікаў раскопак на тэрыторыі Ніжняга замка і паведамленняў “*Хронікі Рывіўса*”[7] пра паганскі алтар, збудаваны над першай разбуранай катэдрай, калі Міндоўг адрокся ад хрысціянства, што апісваў і Т. Нарбут[8]. Прыступкападобная канструкцыя, выяўленая пры раскопках Ніжняга замка, была атаясамлена з тым самым алтаром XIII ст. Наколькі няпэўнай гістарычнай крыніцай з’яўляецца “*Хроніка Рывіўса*” паказаў А. Дубоніс[9].



Адзначым таксама, што імкненне палітыкаў Літоўскай рэспублікі і кіраўнікоў даследчай групы Ніжняга замка да аднаўлення Вялікакняскага палаца выклікала жывыя дыскусіі ў літоўскім грамадстве і пэўную апазіцыю сярод спецыялістаў. Частка літоўскіх спецыялістаў настойвала на тым, што наяўных гістарычных, археалагічных, архітэктурных і іканаграфічных дадазеных недастаткова для навуковага аднаўлення палаца, асабліва яго ўнутранай планіроўкі і інтэр’ераў. А трэба нагадаць, што дыскусія вялася вакол аб’екта ў гістарычным сэрцы Вільні, якая так багата захавала аўтэнтычнай мастацка-архітэктурнай спадчыны. Некаторыя археолагі пакінулі групу па вывучэнню замка.

А пра нечаканыя адкрыцці таго, што можа захоўваць віленская зямля і падмуркі, сведчыць гісторыя са скарбам царкоўных каштоўнасцей XIV–XVIII стст., знойдзеным у сутарэннях віленскай архікатэдры ў 1985 г. і перазахаваным да 1997 г. (іл. 5). Месца, дзе цяпер адбудоўваецца палац Вялікіх князёў, мае надзвычай магутны культурны слой – да 8 метраў, у той час, як у іншых месцах Вільні ён дасягае не больш за 4 метры[10].

Як адзін з варыянтаў захавання рэшткаў вялікакняскага палаца прапаноўвалася музеефікацыя найцікавейшых аб’ектаў, выяўленых падчас архітэктурна-археалагічных даследаванняў. Сёння актыўна вядзецца работа па адбудове вялікакняскага палаца з сучасных матэрыялаў, але з захаваннем аўтэнтычных фрагментаў муроўкі. Палац адбудоўваецца на жалезабетонных палях, а тое, што засталося ад сапраўднага падмурка, плануецца захаваць дзеля экспанавання. У рэканструяваным будынку ў будучым размесціцца музей.

Вывучэнне Ніжняга замка працягвае *Цэнтр даследавання замкаў “Літоўскія замкі”* (*Pilių Tyrimo Centras „Lietuvos pilys“*), а падтрымку рэканструкцыі ажыццяўляе грамадскі “*Фонд падтрымкі гаспадарскага палаца*” (“*Valdovų rūmų paramos fondas*”), дзейнасць якога ўяўляецца феноменам грамадзянскай ініцыятывы[11].

Ці дае нам гісторыя з аднаўленнем Ніжняга замка нейкія ўрокі? Вядома, адбудова падобных маштабных аб’ектаў магчыма толькі ў выніку палітычных рашэнняў дзяржаўных улад. Але ў любым выпадку да абмеркавання перспектыў рэканструкцыі неабходна прыцягваць шырэйшыя прафесійныя і грамадскія колы. Менавіта грамадскае абмеркаванне можа дапамагчы скарэкціраваць палітычныя рашэнні, а грамадскія ініцыятывы могуць значна паспрыяць асветніцкім і рэстаўрацыйным працам.

---

[1] Гл. падрабязней: Kieszkowski W. Dolny zamek wileński // *Arkady*. 1937, № 10. – S. 506—512; Bortnowski W. Przegląd prac konserwacyjnych na górze

Zamkowej w Wilnie w latach 1930—1936 // *Ateneum Wileńskie*. 1938, Rocz. 13, zesz. 1. – S. 211—216; Tautavičius A. *Vilniaus pilies kokliai (XVI—XVII a.) = Изразцы Вильнюсского замка (XVI—XVII вв.)*. – Vilnius, 1969; *Lietuvos pilys*. – Vilnius, 1971. – P. 25—76; Kitkauskas N. *Vilniaus pilys: statyba ir architektūra*. Vilnius, 1989; Drėma V. *Dingęs Vilnius*. – Vilnius, 1991. – P. 82—131; *The Castles of Vilnius*. – Vilnius, 2000.

[2] Pašuta V., Štal I. *Gedimino laiškai*. – Vilnius, 1966. – P. 74—75.

[3] Гл. падрабязней: Kitkauskas N. *Vilniaus pilys: statyba ir architektūra*; Drėma V. *Dingęs Vilnius*. – Vilnius, 1991. – P. 103—111; *The Grand Dukes Palace in Vilnius*. – Vilnius, 1992; *Княжеский дворец в Вильнюсе*. – Вильнюс, 1995. Публікацыі матэрыялаў археалагічнага вывучэння: *Vilniaus Žemutinės pilies rūmai*. [1] (1988 metų tyrimai). – Vilnius, 1989; [2] (1989 metų tyrimai). – Vilnius, 1991; [3] (1990—1993 metų tyrimai). – Vilnius, 1995; [4] (1994—1995 metų tyrimai). – Vilnius, 1999; Kuncevičius A. Die Kacheln aus dem Palast der Großfürsten in Vilnius // *Archälogische Schätze aus Litauen*. Duisburg; – Regensburg, 1992. – S. 71—134.

[4] Коновалов Н., Пономаренко Ю. Время ли восстанавливать замки? // *Известия*. 1960. XII.20, № 300. – С. 4.

[5] Этапы рэканструкцыі гл. падрабязней: Baliulis A., Mikulionis S., Miškinis A. *Trakų miestas ir pilys*. – Vilnius, 1991. – P. 276—277.

[6] Urbanavičius V. Vilniaus Perkūno šventovės klausimu // *Iš baltų kultūros istorijos*. – Vilnius, 2000. – P. 23; Kitkauskas N. *Vilniaus arkikatedros požemiai*. – Vilnius, 1994. – P. 10–18.

[7] Rivius J. Cronika ist aus einer anderer Cronicer ausgezogen und alter Geschichte ausgeschrieben. 1697 // *Lietuvos Mokslų Akademijos Centrinės bibliotekos*, Rankraščių skyrius (*Цэнтральная бібліятэка Акадэміі навук Літвы*, Аддзел рукапісаў). F. 9—3156.

[8] Narbutt T. *Dzieje starożytne narodu litewskiego*. T. 1. – Wilno, 1835. – S. 206—207, 226, 283, 375—377.

[9] Dubonis A. The Case of the Chronicle of Rivius // *Lithuanian Historical Studies*. Vol. 5, 2000. – P. 7—20.

[10] Гл. тэкст перадачы з цыкла «Вострая брама»: http://www.svaboda.org/programs/brama/2002/08/20020804134631.asp

[11] Пра дзейнасць Фонда гл. яго сайт: http://www.lvr.lt/